БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул, д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 23. Менск. Пятніца 19 красавіка 1918 г. Год I

Менск 19/IV.

Ні дарма нашыя народовыя песьняры скардзяцца перад усім сьветам на нішчасную долю свае бацькаушчыны. Ні дарма усе навокал лічуць Беларусь бедным краем.

Яно так і есьць, у істоце.

Глаунай прычынай цяжкай долі Беларусі лічыцца яе беднасць натуральнымі багацтвамі. Але ці-ж можна казаць аб беднасьці натуральнаго багацьця краю, каторы быу на першым мейсцу у Расіі па вывазу лясных матэр'ялау у Эуропу а так сама першым у Эурапейскай Рассіі па лічбе свайго зямельнаго запасу. Досьледы аб мінэральных багацьцях у нас, можна лічыць, што іщчэ і ні пачыналіся.

Паложаны у цэнтру Эуропы наш край быу бы благаслауленем для сваіх жыхароу. Мы бачым, як нівялікія эуропэйскія народы жывуць на бяднейшых абшарах і аднак цвітуць жыццем. Бэльгія і Галяндзія здолалі адваевать сваю землю ад мора, а мы ні можам абсушыць балотау, Данія зрабілася манапольным дастаушчыкам млечных выробау для Англіі, а мы ні завялі нават добрай жывелы. Дары некалі быушаго на нашай зямлі мора ні прыносяць нам ніякай карысьці.

Дзе-ж прычыны таго, што мы аказаліся да гэтых час ніздольными ні толькі выкарыстаць, але пазнаць і ацаніць, тое што мог бы нам даць край?

Прычыны, на наша нішчасьце, далеко за нашымі рубяжамі. Гэта хцівасьць суседзяу, каторыя галячыся на наша *багаце* змагаліся за уладанне ім на нашай тэррыторыі, а пераможны адно другога адцягівалі цэнтр гаспадарскаго жыцця краю да сябе. Вось гэта змаганне і было глаунай прычынай нашай гаспадарчай беднасьці. Абмінаючы ужо грабежную гаспадарчую палітыку чужых цэнтрау, каторыя мелі клопат толькі аб адным, як бы хутчй сарваць тое што лягчэй да гэтаго падаецца, мы павінны успомніць другую прычыну: войны.

Ці есьць іщчэ край у Эуропі: дзе-б на каждай вярьсце пападалося па несколькі курганоу? Беларусь зауседы была пляцдармам, на якім узбраенай рукой рашаліся спрэчкі паміж заходам і усходам Эуропы і вялася грызьня паміж усходнімі эуропэйскімі народамі. Гэтыя людзі, чыя памяць заснула разам з імі у курганох, нясьлі на Беларусь руіну і нішчасьце. Край ніколі ні насьпевау адначыць ад аднэй вайны, як пачыналася другая і гэта было глаунай прычынай яго беднасьці.

Цяперашняя вайна на ус ходзе скончылася. Беларусь пачынае апамінацца ад душыушаго яе амаль ні чатыры гады цяжкаго сну. Хацелося-б на зауседы пазбавіцца ад трывожных думак аб будучыне і як найхутчэй забыцца аб страшнай толькі што не ражытай мінуушчыне.

Аднак весткі, што трапляюць да нас з усходу, з «інтэрнацыяналістскай», савецкай рэспублікі маюць для нас саусім ні успакаяючы характар. Тамака «найсоцыялістычнейшы у сьвеці» народ—вялікадзержаунік шумна бразкая зброяй ні могучы пагадзіцца з уводам яго у яго праудзівыя граніцы. Коміссары і совдепы выдаюць дэкрэты, аб арганізацыі чырвонай арміі, «соцыялістычна»—скарбовыя «Ізвесьція» апрацовываюць опінію грамадзянства. Прауда увесь гэты шум, цяпер толькі шум і выклікае нават усьмешкі, але ен мае і іншае значэнне. Гэта,—прыкмета таго, што іщчэ *захоча Расія*. Прыкмета грозная для Беларусі і ажыуляючая ніданія сны.

Каб пазбавіцца іх Беларусі трэба словамі і дзелам падтрымаць высказаное ужо бажанне жыць уласным жыцям, без уселякай «братняй» апекі.

А для гэтаго патрэбна ніадкладная праца і арганізацыя.

Задання прасьветы.

(*Канец* *).

Другая справа так сама вельмі важная—гэта падгатаванне вучыцялеу. Трэба закладаць новые вучыцяльскіе інстытуты і сэмінарыі, трэба усе істнуючыя зрабіць чыста беларускімі і па духу і па выкладовай мові. Але гэта усе будзе работа на больш ці менш аддаленую будучыну. Цяперака, гэтым летам, трэба арганізаваць сетку курсау для вучыцялеу; гэтае лета, нічога ні зробіш, прыдзецца нашым вучыцелям ахвяраваць вельмі значную частку сваіх вакацыяу і заняць яе працаю на курсах. За гэтае лета трэба усім вучыцялям навучыцца і мові беларускай і навукам беларускім і самае глаунае пранявцца новым духам вольнай беларускай школы, пабудаванай запрауды дзеля асьветы, а ні дзеля руссіфікацыі, або палянізацыі. Такія курсы павінны цягнуцца ні менш 3-х месяцоу і на іх павінны слухаць лекцыі усе вучыцялі. Справа гэтая так сама будзе вымагаць вялікіх накладау; бо вучыцялям трэба забэспечыць можнасьць жыць на два дамы: сам ен на курсах у горадзі, а яго сямья—на мейсцу. Трэба лічыць што такіе курсы могуць каштаваць Беларускай Дзержаві міліонау пяць, калі ні болей.

Такім парадкам, гэтым летам трэба арганізаваць цэлую сетку вучыцяльскіх курсау—прымерна у кожным павеці павінны быць курсы. Тым часам лектароу для гэтых курсау мы маем вельмі мала. Тые пэдагогі і лектары якіе звычайна дауней чыталі на такіх «летніх вучыцяльскіх курсах» нічога супольнаго з беларушчынаю ні маюць. За апошні час знаходзяцца у разных мейсцах нават відные пэдагогі, якія бяруцца за беларускую працу шчыра і ахвотна. Годзі успамянуць імены Ігнатоускаго, Астроускаго, Сьцепуры, Ярушэвіча. Але шмат хто з іх аддзелян ад нас рубяжом і німа ведама, ці здоляе памагчы нам у гэтай вялікай працы. Тые ж спаміж сьвядомых беларусау пэдагогау, якіе знаходзяцца у межах акупацыі, ні зауседы добра падгатаваны у навуцы беларусазнауства. Каб выкарыстаць іхные сілы трэба уперад сабраць іх усіх—будучых лектарау вучыцяльскіх курсау і хоць тыдні два—месяц добра з імі праштудзіроваць важнейшые і спрэчные пытанні беларусазнауства і яго мэтодзікі. Вось гэтаю справаю трэба заняцца ні пазьней як у гэтым жа месяцы, адразу пасьля канца школьных заняццяу. Сабраць лектарау можна альбо у Менск, дзе ужо есьць выжэйшые курсы беларусазнауства, альбо да аднэй з беларускіх гімназыяу—(у Слуцак, альбо Буцлау), дзе есьць спэцыялісты беларузнауцы, а можа найлепей было-б зрабіць такі збор у Вільні, калі-б гэта можна было.

З іншых справау прасьветы беларускай найпільнейшай есьць справа унівэрсытэту. Нілегкая задача пабудаваць унівэрсытэт. Шмат накладау і працы патрабна, але ні можам на яе забыцца ні аднаго дня. І здаецца мне, што калі-б усе удавалася, можна было-б аткрыць адзін факультэт, напр., гісторыко-філолегічны нават з гэтай восяні. Дзеля гэтаго патрэбны толькі дзве рэчы: вялікіе грошы і магчымасьць нашым вучоным, параскіданым па Расіі, прыехаць на бацькоушчыну. А што такіх вучоных, якіе з ахвотаю перайшлі-б у Беларускі унівэрсытэт, есьць ні мала, гэта можна сказаць напэуна. Гісторыко-філолегічна факультэт быу-бы нам вельмі цяпер карысны, бо давау-бы вучыцялеу беларусазнауства, якія нам цяпер проста на гвалт патрэбны. Дзеля гэтаго трэба падумаць, каб і справу унівэрсытэту паставіць на саусім рэальны грунт.

На астатку скажым іщчэ аб аднэй пільнай справі. З нашай старыны пад відам эвакуацыі расійцы зьвезьлі усе якія маглі культурныя вартасьці: лепшыя школы, музэі, асобныя культурныя памяткі. Нашым палітыкам, якіе вазьмуць на сябе заданне—сабраць пакроеную на кавалкі Беларускую Дзержаву, трэба зауседы памятаць, як у нас мала пазасталася зьвязку са старою нашаю культураю, як мы бедны усякімі прасьветнымі установамі. І ім трэба усімі сіламі старацца, каб атабраць ат расійцау і ад усіх іншых любіцеляу чужое маетнасьці нашыя культурныя і павярнуць іх на родныя мейсцы.

Вось якіе вялізарныя заданні трэба здзейсьніць беларусам у самым хутчэйшым часі. Каб гэта усе удалося трэба моцная арганізацыя і вялікая сьвядомасьць свайго абавязку перад Бацькоушчынаю, перажываючаю рашучы момэнт сваей гісторыі. Кожын беларус павінен ведаць, што ен мае рабіць. Можа ен зьбіраць грошы на прасьвету—хай зьбірае ні агледаючыся на іншых, можа далажыць свайго знання—хай кідае усякую іншую працу і ідзе на ніву прасьветы. Бо цяперака школа гэта усе. Яна і толькі яна выгадуе этнографічную беларускую массу на сьвядомае сваіх нацыянальных заданняу грамадзянство Беларускай Дзержавы.

А.

*) Гл. № 22.

Палякі і Украінцы на Холмшчыне і жыдоўскае пытанне.

Уступіўшы у спрэчку з Украінскай народнай рэспублікай за Холмшчыну, Палякі стараюцца пашырыць грунт, на які мацней маглі бы аперціся і дзеля таго увага іх зьвярнулася і на жыдоўскія галасы аб Холмскай справе. Чэнстахоўскі «Dziennik Polski» у 96 № па першым мейсцу памясьціў агляд жыдоўскай прэссы. Прыведзены думкі жыдоўскіх газэтаў «Das lüdische vort», «Hajnt», «Das lüdische Volk», і «Mysli żydowskiej, а так сама п. Гіршторфа у польскім «Monitov»-э. Пры больш-менш ніаднаковых аргумэнтах і стылю глаўная думка ў усіх газэтаў адна: Украіна дала ўжо фактычна нацыянальным меншасьцям на тэррыторыі рэспублікі нацыянзльна-пэрсональную аўтаномію; трэба каб і Польшча стала на тую ж дарогу, калі хочаць ўзыскаць прыхільнасьць жыдоў на Холмшчыне.

Аб сваім паглядзе на жыдоўскую справу газэта актывістаў ні кажа нічога. Толькі гаворыць: «гэтакіе найпраўдзівейшыя жыдоўскія галасы чуюцца аб Холмскай справе. Яны надта навучаючыя і паказуюць на бажання жыдоўскіх колаў»...

Агульныя весткі.

ВЕНА 15/IV. На фронце поўднёва-заходным мейсцамі бой узьвялічыўся.

ВЕНА 16/IV. На фронце італьянскім без перамен.

БЭРЛІН 15/IV. На заседанні Рады Усенямецкаго Зьвязку старшыня прачытаў такую рэзалюцыю: «У справе наладжэння адносін, с прычыны адпаду ад Расіі пагранічных тэрыторый, павэдлуг Рады на першым пляне павінна быць обязпека Гэрманії. Гэта адносіцца насамперш да тэррыторыяу этнаграфічна Польскіх і Літоўскіх.

Рада с радасьцю і гордасьцю вітае асвабаджэнне Прыбальтыйскай Нямеччыны і уважае патрэбным, каб правінцыі Прыбальтыйскія цалiком заставаліся пры Нямеччыне і захавалі свой нямецкі характар.

Рада выказвае пэўнасьць, што як на усходзе, так і на захадзе будзе праведзяна ўсе тое, што вымагае будучая бязпека для немцаў.

Перад усім Бэльгія у справах вайскавых, палітычных і гаспадарскіх павінна залежыць ад Гэрманії, а так сама трэба запатрэбаваць тых заморскіх тэрыторыяў, якія патрэбны для адбудовы і развіцця нямецкай народнай гаспадаркі.

Патрэбны так сама канешна зварот коштаў ваенных, павэдлуг тых вялізарных страт і ахвяр, якія меў нямецкі народ.

Ад нямецкаго парлямэнту павінен дамагацца народ нямецкі, каб адмовіўся ад сваей пастановы 19 ліпня 1917 г. і, ідучы поруч з гістарычнымі выпадкамі, накмеціў сабе такія ваенныя мэты, якія вымагаюцца мілітарным палажэннем».

Пастанова гэта прынята аднагалосна.

ЛЮГАНО 15/IV. Італьянскі міністар справядлівасьці падаў праэкт выбарнаго права кабетам.

КАУКАЗ. Мірная дэлегацыя пасланая прэзыдэнтам Каўказкай Рэспублікі — Чхэідзэ у Трапізонд для перагавораў аб вакругах Карсу, Ардагану і Батуму—вярнулася ні с чым: Турэччына, апіраючыся на § 6 Бярэсьцянскаго трактату, у каторым прызнаецца права на самаазначэнне кажнаго народу, адмовілася вясьці перагаворы аб гэтай справе.

Паведамляюць нам: С 1 красавіка 1918 г. тэрыторыя загаду ваеннаго Курляндзії лавялічана павэдлуг даўнейшай палітычнай граніцы Курляндзіі—паветамі (Крэйсы) фрыдрыхштадзкім і іллукштанскім ажно па лінію ж. д. паміж Вільняй і Дынабургам.

Тры ўгібы тэррыторыі Ліфляндзіі, лежачыя на поўдня ад Дзвіны каля Юнгфэрнгофу, Баркоковіч і Дунгофу, а таксама цыпэль Оксіфія прылучаны да Курляндзіі.

«Dz. Wil.».

Расійскія газэты паведамляюць, што павэдлуг Бярэсьцянскаго трактату расійскае войска ужо эвакуіровала пэрвую тэрыторыю. Перад адходам сваім салдаты расійскія аграбілі палковыя касы па два міліоны рублёў. Мейсцы, якія займалі расійскія салдаты, занялі цяпер Туркі.

«Dz. Wil.».

Весткі з Расіі.

У Саратаве саветам выдан дэкрэт аб абавязковым ўпісе у чырвоную армію усіх работнікаў ад 18 да 43 гадоў, каторыя павінны явіцца для упісу ад 10 да 18 красавіка. Хто ні'явіцца, — выключаецца з профэсіянальнаго звязку, збауляецца права на работу.

У Ніжнім-Ноугарадзе хлебная пайка павялічана да 1/2 фунта ў дзень на чалавека.

Усерасійская Рада профэсыянальных зьвязкаў склікае у Маскве на 1 чэрвеня міжнародную конфэрэнцыю профэсыянальных зьвязкаў.

Луначарскі у сваёй лекцыі аб Пецярбурскай Працоўнай коммуне, якую ён чытаў у Маскве 9 красавіка, заявіў, што Акадэмія Навук у Пацярбургу запрапанавала пецярбурскай камуне свае услугі для апрацавання шырокаго пляну падняцця прадукцыйных сілаў Расіі.

Харчаванне сталіцау у Расіі палепшаецца: ад 1 да 8 красавіка у Маскву прыбыло харчовых і фуражных грузаў 1482 вагоны.

У Маскве пры большэвіцкім урадзе інстуе «Беларускі пацыянальны камісарыят». Выходзіць газэта «Дзянніца».— Вестка беларускаго нацыянальнаго камісарыятуў». Рэдактарам Д. Жылуновіч (Ц. Гартны).

У Серпухові аткрылася контррэволюцыйная арганізацыя пад назовою «Комитетъ здраваго смысла». Правадыры камітэту, быўшыя ахвіцэры, Орлов, Лебедев і Морозов былі арыштаваны за учасьце у ніудачным грабунку на кассу тэкстыльнай хвабрыкі «Акціонернаго Общества». Камітэт быу зьвязаны з Масквою, адкуль падтрымоўваўся грашамі.

У Маскве створэна камісія заграніччнаго гандлю, для аб,- еднання і спалучэння усёй работы у абшары заграніччнаго гандлю с агульна-дзержаўным гаспадарчым плянам.

З Саратава ад 9 г. м. паведамляюць, што тамака духавенства і заможныя селяне вядуць контр - рэволюцыйную агітацыю.

У Курскў праз узгляд на быўшы у Глухаві жыдоўскі пагром районны Савет пазволіў арганізаваць жыдоўскую самаабарону. Самаабарону арганізуюць супольна «Бунд», «Поалэй-Ціон», „Сэрп» і афіцыяльныя прэдстаўнікі Курскай жыдоўскай абшчыны.

У Маскве аткрываецца Акружны народны Суд з двух прыватна-праўных і двух угалоўных адзелаў. Мейсцы прэзэсаў і членаў аддзелаў суда—выбарныя.

Харчовая перапісь адкрыла у Маскве на Данілаўскай цукраварні за Прэсьненскай рагаткаю вялікі запас ніколі ні быўшаго на падрахунку цукру,—173.000 пўдоў.

Безработных друкароў па данным профэсыянальнаго зьвязку ў Маскве налічаецца каля $2^1/_2$ тысячаў.

Архівы даунейшых Ахраннаго аддзелу, Жандарскаго Упраўлення і Судовых Установ быўш. Маскоўскаго округу, перадаюцца пад дагляд камісіі з Ц. І. К. Маскоўскаго савета, Маскоўскай Рады народн. камісароў і комісарыята Юстыцыі. Часова камісарам Архіву пазначаны Катаяні, які для прыему яго явіўся у Гістарычны музэум у таварыстве 20 латышскіх стральцоў.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 18 красавіка 1918 року.

З А Х А Д: Учора непрыяцель аддаў нам большую часьць Фляндрскай раўніны, заваёваную ім раней у працягу пяці месяцаў. Армія генэрала Сікст фон-Арніма узяла у адступаўшаго пэд нашым націскам непрыяцеля Пелькапелле, Лангемарк і Зонбэккэ, адкінуўшы яго за Стэян-Бах. Поўднёвей возера Бланкаарт наш паход затрымаўся контр-атакай непрыяцеля. Поўночней р. Ліс мы пры моцным артылерыйскім падтрыманні узялі часьць мейсцовасьці і нескольки кулямётных гнёздаў. Апошнія баі далі нам больш 2500 палонных, нескольки гарматаў і вялікую лічбу кулямётаў. На абаіх бакох Соммы часамі артыллерыйскі бой, мацнейшы каля Морэйль і Мондідье. На усходнім берагу Мааса каля Орнь і Вагрувіль мы у нівялікіх спатычках мелі удачу і захапілі палонных. Французскі напад поўначней Флірсі (паміж р.р. Маас і Мозэль) скончыліся для непрыяцеля ніўдачаю, з вялікімі для яго стратамі.

З другіх фронтаў вайны нічога новаго.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф**.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Спэкулянты прыпудзіліся апошніх пастановау нямецкай улады а харчах. Пачалася на скорую руку распрадажа даунейшых запасау, узвялічаных ішчэ пры ліквідацыях рожных союзау.

Цана цукру спала з 8 на 5 рубл.; гарбаты—10 на 6; мукі—с 5 на 2 рублі за фунт і т. д.

Начальнік ст. Гомяль атрымау у упрауленні Л. Р. ж. д. тэлеграму а фактычным пераходзе вучастка Жлобін-Ромны пад загад Украінскай Рады.

Гэта, бадай, апошні акорд упраулення Л. Р. ж. д. за тры гады вайны: спачатку Лібава-Солы, потым Лібава-Менск і урэшці Жлобін-Ромны.

Консультацыя прысяжных адвакатау пры Менскім Акружным Судзе пачалася с 16-го красавіка. 17-го красавіка адбылося першае агульнае сабранне членау консультацыі.

У Гарадзкой Управе у пятніцу—19 красіка мае сабрацца камісыя разам с прэдстаунакамі ад саюзу служачых управы, дзе мае быць разгледжаны спісак тых асоб, якім--для змяншэння ліку служачых—прыдзецца пакінуць сваю працу. Такіх набярэцца да 50-ці чалавек.

Выплату авансау дарожным служачым Л. Р. ж. д. за красавік нямецкая жалезнадарожная улада мае пачаць з 20-го г. м.; упрауленцам—з грашэй самога упраулення павэдлуг нормы 1916 году.

Замест 20000000 рубл., якія былі празначылі большэвікі для расплаты са служачымі Л. Р. ж. д., а пасьля затрымалі гэтыя грошы, маюць усе жткі даць палову т. е. 10000000 рублеу.

Служачые Казначэйства падалі немцам рахунак на пэнсію сабе павэдлуг новай устаноулянай большэвікамі нормы. Нямецкая улада гэты рахунак прызнала. Тады запратэставау акружны суд, дамагаючыся, каб ім была заплачана пэнсыя так сама павэдлуг такой самай расцэнкі. Немцы пратэст уважылі і заплацілі служачым казначэйства толькі па даунейшай старой норме, а усю справу абецаліся разгледзіць.

Курсы беларусознауства.

Пятніца 19 красавіка.

Станіслау Лянкоускі. *Гісторыя беларускаго права.*

Субота 20 красавіка.

Т. Грыб. *Нашые песьняры. І. Янка Купала.*

Пачатак лекцыі у 7 гадз. веч.

Лекцыі чытаюцца у памешканні Беларускае Рады (Захароуская, 43).

Весткі с краю.

З Вільні.

7-га красавіка пры краме Т-ва, В. Погулянка 17, адбыуся агульны сход членау Беларускаго Спажывецкаго Таварыства «Райніца». З агульнаго ліку 67 членаў на сход прыбыло 31.

Сход адкрыў скарбнік т-в В. Ластоўскі. Маршалкавал Агульным Сходам прасілі В. Святополк-Мірскаго, на сэ крэтара п. Я. Русецкаго. пададзенаго Агульнаму Сход адчоту выявілося, што, гледзячы на трудные ва рункі цяперашняга жыцця крама за 1917 год зрабіл абароту таварамі на 45.59 мар. і 75 ф.

Агульны білянс т-ва Актыв на 1. І—18. Усяго Мр. 44687 Пассыву на 1. І—18. Усяго Мр. 446877.

Зыск 1681 м. 27 ф. Агульны Сход пастанавіў адчысьліц у запасны капітал і пўсьціц яго ў абарот.

Сьмету расходаў на 1918 г Агульны Сход прыняў у сум 3570 мр.

Да Ураду аднагалосна да браны п.п. Я. Русецкі, С. Се нюць, і М. Міхневіч, да Рэ візыйнай Камісіі—п.п. Шын кевіч і Якутіс.

Гэткім чынам цяпер Урад Спаж. т-ва «Райніца» складаецца с п.п. Рав. Ластоўскага, М. Лойкі, М. Міхневіча Я. Русецкага, А. Стаўсса, С Сенюця і Волосэвіча; Рэвізыйнай Камісія—с п.п. Якутіса Шынкевіча, Шэйніцкага, Войцехоўскага і Заштоўта.

— Таварыство апекі над дзяцьмі «Золак» за студзень люты і марэц 1918 г. выдало для бедных беларускіх дзяцей 24.3000 літровых порцый зупы і 16.200 чверць-фунтовых порцый хлеба.

На адзежў і абуцьце за гэты час таварыство выдало 4.482 м.; на помач лекарствамі пры дармовай дохтарскай помачы выдано 62 м. 74 ф.

У утрымліванай Таварыствам пачатковай беларускай школе у Вільні вучыцца 70 дзяцей, каторыя дастаюць безплатные кніжкі, сшыткі і інш. школьны рыштунак, а такжа дармавую навуку.

Ад 15 красавіка да 1 мая у канцэлярыі прытулку т-ва «Золак» (Бэрнардынскі зав. № 7) ад 1 да 3 гадзіны у у дзень прыймаюцца запісы бедных беларускіх дзяцей на выезд у летніе каленії.

«Гоман».

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **Т-во «Заранка»**.

Друкарня Я. А. Грынблята.